# Урок беларускай мовы

# 1 клас

# Я і навакольны свет. Я і раслінны свет

**Настаўнік : Ігнатовіч Кацярына Сяргееўна**

Ход урока:

**I. Арганизацыйны момант.**

**Арганізацыйны момант**

*Добрае ранне сонцу і птушкам,*
*Добрае ранне сынкам і дачушкам!*
*Добрае ранне ўсім добрым людзям.*
*Шчыра вітацца мы ўсе не забудзем!*
*Званочкам звонкім урок павітаўся.*
*Сядзем за парты. Занятак пачаўся!*

**II. Уводзіны ў тэму**

Добры дзень дзеці! Сёння да нас на ўрок зноў прыйшла Спадарыня Беларуская мова. Адкажыце ,калі ласка, на пытанне, навошта мы вывучаем беларускую мову?
Што будзе, калі людзі перастануць размаўляць па-беларуску?

**III. Арфаэпічная хвілінка**

Давайце разам з вамі ўзгадаем некаторыя асаблівасці гукаў беларускай мовы. Я гавару гук, а вы паўтарайце і адначасова ўзгадвайце словы з гэтым гукам.
[г], [дж], [дз'], [ч], [ў].

**IV. Пастаноўка задач**

А зараз вызначым, чым мы сення будзем займацца на ўроку беларускай мовы, а дапаможа нам ў гэтым воблака слоў.




**V. Узнаўленне ведаў.**

Паказ малюнкаў з выявамі жывёл, дзеці называюць жывёлу і яе дзіцяня, потом шукаюць назву гэтай жывёлы ў філвордзе і рознакляровымі алоўкамі размалёўваюць яе. *(заданнее на рабочым лісце)*

Размалюйце жывёлу, якая з'яўляецца сімвалам РБ. *(заданнее на рабочым лісце)* Якая птушка таксама з'яўляецца сімвалам РБ? Назавіце яе дзіцяня? Працягнеце маё выказванне: бусел – сімвал сямейнага … (шчасця) .Як называецца гняздо бусла?

**VI. Тэма ўрока. Мэта ўрока.**

**<u>Уводзіны ў тэму.</u>**

Давайце яшчэ раз звернемся да воблака слоў. На што падобна яго выява? Што такое цюльпан? (кветка) Значыць сення на ўроку мы з вамі будзем знаёміцца з назвамі кветак і іншын раслін, якія растуць у Рэспубліцы Беларусь.

1. **Гульня “Дрэва ці кветка?”**
   - А зараз крыху пагуляем. Я вам называю  расліну, а вы ўгадваеце, што гэта – дрэва ці кветка:калі гэта  дрэва – вы падымаеце рукі ўгору і становіцеся на на насочкі,калі гэта кветка – вы прысядаеце.
   *Бяроза, гладыёлус,**пралеска**,  рабіна, цюльпан, **званочак,** елка, **ружа**, **рамонак,** сасна,**валошка**, **дзьмухавец**, ліпа,**сланечнік.*** (Адкрываю на камп’ютары па адным.)

Чаму пачуўшы некаторыя назвы раслін, вы не ведалі, што трэба рабіць? (назвы не супадаюць з рускай мовай)

2. **Знайдзі адпаведнасць**
   Давайце яшчэ раз узнавім назвы кветак на беларускай мове. Для гэтага злучым назву расліны з яе выявай. *(заданнее на рабочым лісце)*
3. Паслухайце верш і адкажыце, назвы якіх кветак вы ў ім пачулі, ці правіль падпісаны малюнкі на слайдах?
4. **Фізхвілінка “Дзяўчынка-беларусачка”**
5. **Адгадай загадкі:**

*Ля дарогі — шарык белы,*
*Вецер дзьме, а шарык цэлы.*
*А як дзьмухнуць хлапчукі –*
*Пух ляціць ва ўсе бакі.*

*Цвіту ўсё лета я,*
*Жыву звычайна ў жыце.*
*Нашу хлапечае імя.*
*Як зваць мяне, скажыце?*

*Узімку цыбулінка спіць-спачывае.*
*Прачнецца – і кветкі наволю пускае.*
*Хай снег, хай мароз – у вясновым падлеску*
*Красуюць блакітныя кветкі –...*

*У гародзе ля дарожцы*
*Стаіць сонейка на ножцы,*
*Жоўтыя праменьчыкі палаюць,*
*Але не апякаюць.*

*На пруточку — буйны цвет, дробныя калючкі...*
*Не падлазь ка мне, малы, бо паколеш ручкі.*

6. **Работа ў парах.**
   - Вакол нас шмат раслін. Некаторыя прыходзяць у кожную хату у выглядзе хлеба, абруса, дранікаў.

- А вось як яны да нас прыйшлі хлеб, абрус, дранікі вы даведаецеся, калі пранумаруеце малюнкі па парадку *(заданнее на рабочым лісце)*

Тры вучні працуюць каля дошкі, астатнія – за партай. У вучняў наборы картак па тэмах “Хлеб”, “Абрус”, “Дранікі”.

Першая пара:

Карткі з малюнкамі: поле ільну, лён збіраюць, ільняныя ніткі, тканіна з ільну, абрус.

Другая пара:

Карткі з малюнкамі: поле бульбы, бульба, цёрка, патэльня, дранікі.

Трэцяя пара:

Карткі з малюнкамі: поле пшаніцы, каласы, мука, хлеб.

(Пасля выканання дзеці правяраюць).

**Фізхвілінка для вачэй**

**VII.Праца над казкай**
Сёння вы будзеце слухаць казку “Дзьмухавец - Пузанчык” аўтара Алены Рыгораўны Кобец-Філімонавай. Вы будзеце вучыцца правільна ўспрымаць на слых і вымаўляць гукі [дз’], [ц’]; правільна чытаць па-беларуску.
**1. Слоўнікавая работа:**

-У казцы сустрэнуцца словы (на дошцы):

*пачула шэпт – услышала шёпот*

*плот- забор*

*прыгожы – красивый*

*цікавы - интересный*

*уважліва - внимательно*

*вельмі ганарыўся – очень гордился*

*спярша – сначала*

*пялёсткі - лепестки*

*выхваляўся – видите, хвалился*

*надзьмуўся - надулся*

*падзівілася - удивилась*

*у паветры – в воздухе*

*замест - вместо*

*доўгае сцябло – длинный стебель*

-Адкрыйце падручнікі на патрэбнай старонцы. Сачыце за маімі словамі па малюнкаваму раду.

**2. Чытанне казкі настаўнікам.**

**3. Замацаванне вывучанага.**

**Адказы на пытанні па асэнсаванню пачутага:**

**-** Спадабалася вам казка? Ці былі незразумелыя словы? Пакажыце на малюнках сцябло з макаўкай.

- Дзе гуляла дзяўчынка?

- Што пачула Соня?

- Як гаварыў пра сябе Дзьмухавец?

- Ці спадабалася вам яго гутарка?

- А як вялі сябе Незабудкі?

- Што адбылося далей?

- Як да гэтага аднеслася дзяўчынка?

- Як суцешыла ўнучку бабуля?

- Якога малюнка не хапае? Што на ім трэба адлюстраваць?

- Падумайце, чаму Дзьмухавец у казцы называецца Пузанчыкам?

**4. Хвілінка адкрыццяў:**

**-** Куды ў казцы зніклі парашуцікі? (За плот суседняй дачы).

- Адгадайце загадку:

*Абступіў ён агароды,*

*Абабег дамы, сады*

*І вакол жывой прыроды*

*Так прастойвае гады. (Плот)*

- Пакажыце на малюнку.

- У рускай мове таксама ёсць слова “плот”.

*А вот я – с другой судьбою:*

*Часто вижу города,*

*Дружен я всегда с рекою,*

Путь мой – быстрая вода. (Плот)

- Чым яны адрозніваюцца па сэнсе?

**VIII.Вынік урока.**

- Якую казку вы сёння слухалі на ўроку? Наша галоўная мэта была – паслухаць казку і навучыцца новым словам. З якімі словамі пазнаёміліся? (на слайдах) Які першы гук у слове “дзьмухавец”? ( [дз’] ). А з якім гукам яшчэ чыталі словы? ([ц’])

**IX. Рэфлексія.**

- Хто лічыць, што працаваў на ўроку добра, з усёй аддачай – размалюйце кветку ружовага колеру. Хто лічыць, што на ўроку не вельмі актыўна працаваў, але на наступным уроку будзе лепш працаваць – жоўтага колерку. А хто ўпэўнены, што на ўроку сядзеў дарма – сіняга колеру.

- У нас з вамі атрымаліся цудоўныя і вельмі прыгожыя кветкі, усе яны: рамонкі, валошкі, звоночкі і іншыя - сімвалы нашай Беларусі. Мы ўсе разам ствараем сілу і моц нашай Радзімы.

*Як песню вясной жаўруковую,*

*Шануй беларускую мову!*

*Шануй і любі яе, родную,*

*Каб мог ты на ей заспяваць,*

*Каб мог і зімою халоднаю*

*Той песняй сяброў саграваць.*